*Новае прачытанне*

Вольга ШЫМАНСКАЯ,
кандыдат філалагічных навук

# "ХАМ" ЭЛІЗЫ АЖЭШКІ: ГЛЫБІННЫЯ СУПЯРЭЧНАСЦІ НАРЦЫСІЧНАЙ АСОБЫ

У артыкуле разглядаюцца паталагічныя праявы нарцысічнага разладу асобы ў вобразе Франкі Хамцуўны, гераіні псіхалагічна-бытавога рамана "Хам" Э. Ажэшкі. На прыкладзе ўчынкаў жанчыны аналізуюцца такія рысы нарцыса, як перабольшанае пачуццё ўласнай значнасці і прага да пацверджання ўнікальнасці, няўрымслівасць, зайздрасць і агрэсія. Асобна разглядаюцца праявы нарцысізму ў адносінах да партнёра – першасная ідэалізацыя і фінальнае абясцэньванне, чаргаванне збліжэння і аддалення. На прыкладзе стасункаў Паўла і Франкі выкрываюцца дысфункцыянальныя прыметы зносінаў, выяўленне якіх мае вялікае значэнне для псіхалагічнага сталення чытацкай аўдыторыі.

Ключавыя словы: *нарцысічны разлад асобы, нарцыс, нарцысізм, псіхалагічны раман, псіхалагічны падыход у літаратуразнаўстве, мастацкая літаратура.*

The article examines the pathological features of narcissistic personality disorder in the image of Franka Khamtsuwna, the heroine of the psychological novel "Cham" by E. Azeska. Franka's narcissistic traits such as exaggerated feeling of self-importance, excessive craving for admiration, restlessness, envy, and aggression are analyzed. Manifestations of narcissism in relation to the partner are considered separately, including primary idealization and final devaluation, alternation of rapprochement and removal. The relationship between Pavel and Franka reveals the dysfunctional signs of communication, the detection of which is of great importance for the psychological maturation of the reader.



Праблема нарцысізму як адной з паталагічных праяў разладу асобы актуальная ў сувязі з сучаснымі сацыяльнымі прыярытэтамі, якія ўхваляюць індывідуалізм і знешнюю паспяховасць, пачуццё ўласнай выключнасці і ўпэўненасці [4, с. 75; 3, с. 10], прычым са сферы абмежаванага ўжытку тэрмін *нарцысізм* паступова пераходзіць у агульнаўжывальную лексіку. Так, паводле дадзеных Беларускага нацыянальнага корпуса [2], назоўнік *нарцыс* (без уліку ўласных імёнаў і алюзій) ужываецца для абазначэння рыс асобы прыкладна ў 14 выпадках супраць 150 (найменне кветкі), а пошук у сеціве выяўляе выпадкі яго ўжывання ў беларускім навуковым, публіцыстычным ды мастацкім дыскурсе.

У той час як нарцысізм можа быць нармальным і спрыяць дасягненням і самарэалізацыі, паталагічны нарцысізм сацыяльна небяспечны, асабліва для партнёра ў блізкіх адносінах. Прывязанасць да нарцыса і стасункі з ім могуць прывесці да зніжэння самаацэнкі, страты навыкаў крытычнага мыслення, фарміравання пачуцця непаўнавартаснасці [3, с. 14]. Для сучаснага чытача надзвычай карысна, калі актуальная задача псіхалагічнай асветы можа быць рэалізаваная без звароту да спецыяльнай літаратуры, а дзякуючы выхаваўчай функцыі мастацкай літаратуры.

Прыклад твора з вялікім выхаваўчым патэнцыялам – псіхалагічна-бытавы раман "Хам" Элізы Ажэшкі (6 чэрвеня 1841 г., вёска Мількаўшчына Гродзенскага раёна – 18 мая 1910 г., Гродна). Напісаны на польскай мове з уключэннем беларускіх моўных адзінак, ён выяўляе супярэчнасць поглядаў і маралі простых сялян і сапсаваных гарадскімі спакусамі "паноў" на прыкладзе апісання сустрэчы і далейшых адносін нёманскага рыбака Паўла Кабыцкага і пакаёўкі Франкі Хамцуўны.

Раман "Хам" – выдатная спроба апісання глыбінных супярэчнасцей нарцысічнай асобы і крыніца каштоўных абагульненняў і адкрыццяў для сучаснага чытача. Зразумела, што ў XIX ст. не існавала тэрміна *нарцысізм* (ён быў уведзены З. Фрэйдам на пачатку XX ст.) і аўтарка імкнулася адлюстраваць рэлігійна-этычную дактрыну, стварыўшы вобраз духоўна багатага, але малаадукаванага беларускага народа. У той самы час глыбокая і дэтальная распрацоўка вобраза Франкі Хамцуўны, што істотна апярэдзіла клінічную дыягностыку нарцысізму, робіць магчымай рэалізацыю важнай функцыі мастац-

кай літаратуры – псіхалагічны аналіз паводзінаў асобы.

Польская даследчыца Магдалена Дзюгель-Лагуна лічыць, што ў Франкі быў пасіўна-агрэсіўны разлад асобы [5, с. 114], аднак такі дыягназ хутчэй памылковы, бо для яго характэрная адсутнасць знешніх праяў агрэсіі з-за страху пакарання пры вонкавым захаванні пакоры і добразычлівасці, а Франка распавядае, што не раз стаяла перад судом за напады на гаспадароў. Больш за тое, на сёння пасіўна-агрэсіўны разлад асобы не вылучаецца ў медычных класіфікацыях – ён аднесены да іншых разладаў асобы, у адрозненне ад нарцысічнага разладу, які пералічаны ў DSM 5 (наменклатуры псіхічных захворванняў). М. Дзюгель-Лагуна мяркуе, што Франка – ахвяра заўчаснай сексуалізацыі, якая ў сталым узросце імкнецца да самазнішчэння [5, с. 144]. Стан Франкі ў некаторай ступені падобны да памежнага разладу асобы, бо ёй уласцівая імпульсіўнасць, высокая ступень трывогі і дысацыялізацыя. Агульнымі для памежнага разладу асобы і нарцысізму выступаюць няўрымслівасць, раптоўны бескантрольны гнеў, змена адносінаў ад ідэалізацыі да абясцэньвання, а таксама схільнасць да суіцыду. З пазіцый псіхалагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве нам цікава прааналізаваць паталагічныя рысы ў паводзінах Франкі з мэтай фарміравання навыку выяўлення такіх рысаў у адносінах і ўхілення ад псіхалагічна небяспечных стасункаў.

Згодна з сучаснымі даследаваннямі, паталагічнаму нарцысу ўласцівыя наступныя рысы: пачуццё ўласнай перавагі над іншымі і адначасова страх быць горшым за іншых, у выніку чаго нарцыса адольвае зайздрасць і нянавісць; тэндэнцыя да ідэалізацыі, што праз нейкі час змяняецца дакорамі, асуджэннем і агрэсіяй; імкненне да зближэння, якое чаргуецца з раптоўным аддаленнем; пастаянная патрэба ў пацвярджэнні сваёй унікальнасці; няўрымслівасць і неўраўнаважанасць; няўменне несці адказнасць за ўчынкі, абвінавачванне іншых людзей ці абставін [3; 4].

Для нарцысічнай асобы характэрна імкненне да новых эмоцый і пацвярджэння сваёй велічнасці. Пры першай сустрэчы з Франкай на рацэ Паўла здзіўляе, які вялікі лямант яна ўзняла з-за таго, што ўпусціла ў ваду адзежыну. Праз некалькі хвілін знаёмства Франка забываецца на праклёны – яна ўжо ахопленая новымі ўражаннямі: "*Ён глядзеў на жанчыну і дзівіўся, як гэта яна магла так хутка перайсці ад плачу і лямангу да вясёлага залівістага смеху*" [1, с. 10]. Павел захапляецца няўрымслівасцю Франкі, бо яна ўносіць у ягонае жыццё яркія эмоцыі, дзіцячую непасрэднасць. Эліза Ажэшка, апісваючы ўзбуджэнне Франкі ад усяго новага, заўважае, што гэта было не захапленне, а цікавасць і здзіўленне, пякучая прага ўражанняў: "*Як ашалелая, як п'яная, бегала па востраве*" [1, с. 21].

Аднак захапленне нарцыса вельмі хутка праходзіць: не маючы здольнасці адчуваць спакойную радасць і задаволенасць, нарцыс шукае новых эмоцый і не можа ўседзець доўгі час на адным месцы. Калі Франка апавядае Паўлу пра ўласнае жыццё, яна неаднаразова прыгадвае сваю зменлівасць: "*На адным месцы я заўсёды знуджуся – і бывайце! Гэткі ўжо ў мяне характар*" [1, с. 12]; "*не гэты, дык другі*" [1, с. 30]. Ужо ў першыя дні Павел трапляе ў пастку "выратавальніка", бо мяркуе, што можа выратаваць распусную жанчыну ад грахоўнага жыцця, менавіта таму Павел прапануе Францы шлюб і прыстойнае жыццё ў вёсцы. Герой не можа зразумець, што прага новых эмоцый, захапленні і расчараванні – невылечныя сімптомы разладу асобы: "*Каб вы ведалі, як мне тут сумна!*" [1, с. 14]; "*...за чалавекам, які ёй спадабаўся, за новымі ўражаннямі і забавамі жанчына гэта гатова была паляцець на край свету... адсутнасць іх магла давесці яе да вар'яцтва*" [1, с. 18].

Я-канцэпцыя нарцысічнай асобы характарызуецца ці рэзка негатыўнай, ці рэзка завышанай самаацэнкай, пачуццём унікальнасці. У залежнасці ад перавагі той ці іншай тэндэнцыі вылучаюць грандыёзны і ўразлівы тыпы нарцысізму [4, с. 77]. Франка ілюструе грандыёзны тып, бо ў кожным зручным выпадку не забываецца прыгадаць сваё добрае паходжанне: "*Я дзяўчына з добрай сям'і... Бацька мой у канцыляры і служыў*" [1, с. 11]. Нарцыс бясконца прагне пацвярджэння велічнасці.

У структуры самаадносін нарцысічнай асобы закладзена супярэчнасць: станоўчае стаўленне да сябе захоўваецца дзякуючы веры ва ўласную ўнікальнасць і абранасць, аднак менавіта гэтыя рысы служаць глебай для зайздрасці і маніпуляцый у зносінах [4, с. 83]. Зайздрасць нарцысічнай асобы накіраваная як на тое, што мае іншы чалавек (у прыватнасці, партнёр), так і ўвогуле на адчуванне задаволенасці і шчасця, якое для нарцыса недасяжнае: "*Добра вам жывецца, – уздыхнула яна. – Хату ўласную маеце і заробак неблагі... можаце жыць, як той пан!.. Гэта зусім не тое, што ўсё жыццё па чужых кутах ацірацца...*" [1, с. 20]. Як відаць, нарцыс заўсёды параўноўвае сябе з іншымі і пакутуе, калі не валодае нечым. Зайздрасць і нянавісць, што з яе вынікае, праяўляюцца пазней у адносінах Франкі да Ульяны, сястры Паўла, з якой Франка не магла спаборнічаць у побыце, на гародзе, у ткацтве.

Нарцысу патрэбна ўсё, што мае яго партнёр – поспех, знешнасць, радасць; часта нарцыс не

ўсведамляе гэтага і пачынае абясцэньваць усё вартае, напрыклад, робячы партнёру заўвагі адносна знешнасці (на самай справе нарцыс лічыць недасканалым сябе) ці паводзінаў [3, с. 11]. Калі Павел папрасіў Франку навучыць яго чытаць, яна спачатку аслупянела, а потым зрабілася вельмі паважнай: "*Вось што значыць паходзіць з добрага роду!*" [1, с. 82]. Аднак у хуткім часе яна ўжо злавалася на маруднасць вучня, а найбольш – на тую засяроджанасць і радасць, якія Павел адчуваў. Для яго было шчасцем навучыцца новаму, навучыцца чытаць Слова Божае і наблізіцца да духоўнага святла.

Першасная ідэалізацыя сітуацыі ці партнёра, а потым абясцэньванне – адна з самых адметных нарцысічных праяў, якая павінна насцярожыць у адносінах. Чалавек нарцысічнага тыпу на першых этапах ідэалізуе партнёра, гэта абарончы механізм, што дае адчуванне значнасці, атрымання жаданага трафея [3, с. 11]. Пры першай сустрэчы з Паўлам на рацэ, у першыя дні спатканняў Франка захапляецца ім: "*Цікава, селянін, а такі ветлівы, разумны*" [1, с. 13]; "*Прыгожы хам! Хоць не такі ўжо малады, але прыгожы і нейкі мілы... мілы...*" [1, с. 16]; "*Ці ты, можа, святы?*" [1, с. 34]; "*Такога добрага і мілага, як жыву на свеце, не бачыла*" [1, с. 35]. Калі Павел прыводзіць Франку ў вёску і знаёміць з роднымі, яна гэтаксама захапляецца імі, абдымае Ульяну, просячы набыць сарочкі: "*Мая міленькая, залаценькая, брыльянтавая, купіце!*" [1, с. 53]. Калі пазней, рухомая неспатольнай прагай эмоцый, Франка закахаецца ў васямнаццацігадовага Данілку, яна будзе ўхваляць яго: "*Глянь, Марцэлька... які прыгожы хлопец стаў Данілка...*" [1, с. 182]; "*Вось і ён таксама хам, але зусім не такі, як усе хамы... Маладзенькі, зграбны і грубіянству яшчэ не навучыўся...*" [1, с. 193].

Нарцыс "зачароўвае і зачароўваецца", і бяда ў тым, што яму самому здаецца, што ўсё шчыра, таму і партнёр верыць у шчырасць пачуццяў нарцыса [3, с. 11]: "*Ён верыў, што ніхто ў свеце не можа прысягаць фальшыва*" [1, с. 41]. Пасля шлюбу з Франкай Павел быццам памаладзеў і ўвесь ззяў ад шчасця: "*Ой, як добра! Чаго хацеў, тое і маю... Але найбольш я дзякую Богу за тое, што душу людскую выратаваў*" [1, с. 57]. Франка таксама пачувала сябе шчаслівай, бо мела "*новыя, радасныя ўражанні*": "*Жыву, як каралева*" [1, с. 59]; "*Для мяне тут упершыню адкрылася шчасце, якое я ніколі не сніла*" [1, с. 38]; "*Весела было Францы на рацэ з мужам, не сумавала яны і тады, калі заставалася часам у хаце адна*" [1, с. 61]. Як мы ўбачым у рамане, другі партнёр траціць шмат сіл (а ў ролі "выратавальніка" нават прысвячае гэтаму жыццё), імкнучыся "напоўніць" адвечную пустэчу душы нарцыса, аднак такая задача невыканальная, і ў выніку расчараванне і абурэнне нарцыса будуць настолькі жорсткімі, наколькі моцнай была першапачатковая ідэалізацыя [3, с. 11].

Першы пераход Франкі ад захаплення да зняважы мы бачым, калі яна расказвае пра тое, як яе будучы шлюб успрынялі гаспадары, у якіх яна працавала: аказваецца, што сваякі Франкі адмовяцца ад яе, а маці "*перавернецца ў труне*": "*Цяпер бы і родны бацька мяне не пазнаў, а маці, каб убачыла, перавярнулася б у магіле!.. Гэты выбух роспачы пасля яе бурнай весялосці так здзівіў Паўла, што нейкую хвіліну ён стаяў на месцы, разявіўшы рот*" [1, с. 54]. У гэты час пачынаюцца і персанальныя заўвагі, прыніжэнне партнёра – вельмі небяспечныя ўчынкі, якім Павел не аддае належнай увагі: "*Чым ты вышэйшая, а я ніжэйшы?*" [1, с. 44]. Паўлу не зразумела, што знявага і абясцэньванне – самы вялікі пасаг, што мае ягоная нявеста. Нават калі Франка вучыць яго чытаць, ён не зважае на абразы, так праяўляецца схільнасць Паўла да дысфункцыянальных зносінаў, у якіх "разгортваецца драма рашчаплення, самаўзвялічвання і самаабясцэньвання нарцысічнай асобы" [4, с. 77].

Нарцысу, які ў дзяцінстве сутыкнуўся з нястачай эмпатыі, неабходнай для фарміравання ўяўлення пра сябе, пастаянна патрэбная ўвага і падмацаванне яго прыгажосці і паспяховасці [3, с. 11]. У той час як для дзіцяці нармальна быць у цэнтры ўвагі і адчуваць сябе галоўным у свеце – для дарослага чалавека гэта вялікая праблема. Пакута нарцыса ў тым, што не задаволеная ў дзяцінстве базавая патрэба робіцца спадарожніцай усяго жыцця, неспатольнай прагай, адвечным чаканнем нязбытнага. Гэта і ёсць "глыбінныя супярэчнасці нарцысічнай асобы" [4, с. 85], супярэчнасці паміж узвышэннем над іншымі і адчуваннем уласнай непаўнавартаснасці, жаданнем ухвалення і страхам выкрыцця недасканаласці.

Такія супярэчнасці выяўляюцца і ў чаргаванні збліжэння і ігнаравання ў стасунках, якое павінна насцярожыць ужо напачатку. Нарцыс няздольны да блізкіх адносінаў, заснаваных на даверы, спачуванні, прыманні, ён быццам загнаны ў пастку – шукае блізкасці і адначасова пазбягае яе [3], набліжаецца, каб адштурхнуць. Калі Павел з Франкай гулялі па востраве, яна спачатку спакушала яго, а потым абвінавачвала ў бессаромнасці: "*Які ж вы добры чалавек!*" [1, с. 22]; "*Бач, які! Здаецца, добры, ветлівы, а такі самы, як усе*" [1, с. 23], а потым зноў прасіла: "*Не адыходзьце! Я з вамі ні на хвілінку б не разлучалася!*" [1, с. 23]. Рэакцыяй Паўла на такую непаслядоўнасць было здзіўленне і збянтэжанасць, аднак такія паводзіны не насцярожвалі яго, наадва-

рот, ён бачыў у іх нейкую дзіўную нясталасць: "*Дзіця, дый годзе!*" [1, с. 19].

Акрамя жадання ўвагі і ўзвышэння, нарцыс імкнецца супрацьпаставіць сябе іншым, даволі часта – праз абразы і прыніжэнне: "*Вось дурныя хамы! Вось быдла!*" [1, с. 75]; "*Я вашай хамскай работы ніколі не рабіла і рабіць не буду!*" [1, с. 70]; "*У параўнанні з табой я пані! Княгіня! Каралева!*" [1, с. 201]. Адна з асноўных прыкмет паталагічнага нарцыса – асуджэнне і абраза іншых людзей, імкненне абвінаваціць свет ва ўсіх няўдачах. Так, гаворачы пра жыццё ў горадзе ці на службе ў гаспадароў, Франка прыбягае да абагульненняў і негатыўных ацэнак: "*Добрага слова ніколі не пачуеш, людскога аблічча не ўгледзіш*" [1, с. 14]; "*Які гэта дом? Пекла, а не дом!*" [1, с. 23]; "*Ніколі ніхто не шкадаваў мяне, усе мяне крыўдзілі, і найбольш тыя, што нібы любілі мяне*" [1, с. 36]; "*Сірата, якую ніхто па-сапраўднаму не палюбіць і не прыгарне; я нікога не маю*" [1, с. 31]. Праклёны Франка адрасуе не толькі гаспадарам, але і сваёй маці, і нават малому сыну Актавіяну: "*Каб гэткіх матак свет не бачыў!*" [1, с. 28]; "*Бацькоў мне Бог даў шэльмаў!*" [1, с. 25]; "*Хай і яго [Актавіяна] д'яблы возьмуць!*" [1, с. 192].

Цікава, як у рамане пераклікаюцца два жаночыя нарцысічныя вобразы – Франкі і старой жабрачкі Марцэлі. Франка прыняла жабрачку Марцэлю, якая завітала ў хату, вельмі цёпла, бо тая нагадвала ёй пра панскае жыццё. Марцэля напачатку захапляецца "паняй", ухваляе Паўла, што пестуе жонку, але ў глыбіні душы зайздросціць бесклапотнасці Франкі. Як нарцыс, Марцэля выкарыстоўвае Франку як сродак задавальнення сваіх базавых патрэб, адначасова наталяючы прагу зняважыць іншага: "*Марцэля прагна ўмінала жытні хлеб… а Франка ў размове з ёй рабілася ўсё больш пахмурнай*" [1, с. 65]. Марцэля спакваля абясцэньвае жыццё Франкі (бо ў Марцэлі такога няма): "*Паненка ты… Мяне дзіва бярэ, як гэта ты за мужыка пайшла*" [1, с. 64]. У выніку ў душы гераіні зноў абуджаецца адчуванне непаўнавартаснасці, абдзеленасці: "*Вось да чаго я дайшла! Мужычкай стала, жывая ў магілу легла*" [1, с. 65]. Менавіта Марцэля спрыяе амаральным учынкам Франкі з лёкаем новых паноў, а пасля і братам Ульянінага мужа Данілкам.

Паралелізм нарцысічных праяў бачым і ў тым, як, падтакваючы адна адной, жанчыны праклінаюць былых гаспадароў: "*Абедзве яны пасылалі самыя жахлівыя праклёны свету*" [1, с. 96]; "*Каб іх паралюш схапіў! Каб ім косці пакруціла!*" [1, с. 96]. У той самы час важна разумець, што Марцэля не вінаватая ў змене Франкі – рана ці позна гэта здарылася б, бо за свае ўчынкі чалавек нясе адказнасць сам, а пошукі вінаватых – прыкмета псіхалагічнай няспеласці.

Завышаная, але ўразлівая самаацэнка – ключ да разумення нарцысізму; уразлівасць выклікае пошук зваротнай сувязі для падтрымання кволай самапавагі, таму для рэгуляцыі самаацэнкі нарцыс прыбягае да абясцэньвання і прыніжэння іншых [4, с. 84–85]. Імкненне Паўла да выратавальніцтва і вера ў выпраўленне Франкі вымушаюць яго некалькі разоў паўтараць памылкі, даравацць і давяраць. Бессэнсоўнасць спробаў наладзіць адносіны з нарцысічнай асобай неаднаразова паказваецца ў рамане. Так, калі Павел прымае распусную жонку пасля трохгадовай адсутнасці, спачатку лагодная і ўдзячная, яна зноў робіцца агрэсіўнай і жорсткай, паўтараючы ўжо вядомую ёй мадэль паводзінаў: "*Які б ён ні быў добры, а ўсё ж хам!*" [1, с. 184].

Найбольшай напружанасці ўнутраны і знешні канфлікт твора дасягае, калі Францы даводзіцца сутыкнуцца з наступствамі ўласных учынкаў і маральных паводзінаў. Тое, што не толькі сваякі, але і ўся вёска асуджае яе, даводзіць Франку да шаленства, і яна пераходзіць да адкрытай агрэсіі і пагроз, у якіх канцэнтруюцца асуджэнне, абясцэньванне і расчараванне: "*Гной табе вазіць, а не кніжкі чытаць, хамула!.. Лепш бы я кваканне жаб слухала, чым гэтае хамскае чытанне!*" [1, с. 202]; "*Я пакажу вам, хамы, хто я такая!*" [1, с. 208]; "*Каб яму дабра не было ні на гэтым, ні на тым свеце!*" [1, с. 192]; "*Прыкінуўся добрым і далікатным, а цяпер паказаў, хто ён!*" [1, с. 193]; "*Так ненавіджу, што, здаецца, забіла б…*" [1, с. 194].

У роспачы Франка пасекла Пііпаў парам сякерай, адкінула дачку Ульяны Марыську так, што тая ўдарылася аб плот, пагражала забіць Ульяну, спаліць Піліпаву хату, падушыць дзяцей. Разлад паміж уяўнай ідэальнасцю і наяўнай ганьбай разрывае душу гераіні: "*Хату вашу з дымам пушчу… Мая маці на фартэпіяна грала… Я на вас паліцыю і суд напушчу… Я пані з паноў…*" [1, с. 209]. Франка не жадае несці адказнасць за свае ўчынкі, яна вінаваціць іншых. Нават гатуючы для Паўла страву з атрутай, усведамляючы злачынства, кажа: "*Бог пакараў мяне за тое, што сама сябе шанаваць не ўмела і з хамамі параднілася! Вось што мне цяпер даводзіцца рабіць!*" [1, с. 213].

Жаданне няспыннага пацвярджэння ўнікальнасці ў спалучэнні з негатыўным міжасабовым досведам, няўдачамі і вырачэннем [4, с. 84] становіцца прычынай трагічнага фіналу галоўнай гераіні, якая не змагла змірыцца з унутранай трагедыяй неадпаведнасці фантазій і рэальнасці.

Падводзячы вынікі аналізу глыбінных супярэчнасцей нарцысічнай асобы ў рамане Элізы Ажэшкі, мы ўдзячныя аўтарцы за карысныя ўрокі і высновы: збліжэнне і раптоўная халоднасць, захапленне і нечаканыя абразы, праклёны і асуджэнне іншых без прызнання ўласных хібаў – праявы разладу асобы, якія павінны насцярожваць у адносінах. Суправаджаючы Франку на працягу ўсяго рамана, чытач час ад часу разам з Паўлам шкадуе жанчыну, часцей – асуджае і абураецца. Аднак не зважаючы на ўласную інтэрпрэтацыю ўчынкаў Франкі, хочацца падкрэсліць менавіта павучальную вартасць гэтага мастацкага вобраза ў рамане Элізы Ажэшкі, дзякуючы таленту якой чытач можа навучыцца выяўляць рысы паталагічнага нарцысізму і пазбягаць драматычных падзей ва ўласным жыцці.

**Спіс літаратуры**

1. **Ажэшка, Э.** Хам / Э. Ажэшка ; пер. з польск. мовы Я. Бяганскай. – Мінск : Папуры, 2016. – 255 с.

2. **Беларускі N-корпус** [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://bnkorpus.info/. – Дата доступу : 10.02.2021.

3. **Гурина, Е. С.** Клиническая картина любовных отношений с партнером нарциссического типа / Е. С. Гурина // SMALTA. – 2019. – № 4. – С. 10–14.

4. **Польская, Н. А.** Нарциссические черты личности и их взаимосвязь с разными аспектами самоотношения в молодёжной выборке [Электронный ресурс] / Н. А. Польская, Ю. А. Соловьянова // Клиническая и специальная психология. – 2019. – № 4, т. 8. – С. 74–92.

5. **Dziugiel-Łagпa, M.** The Negativistic Female Personality in Cham by Eliza Orzeszkowa = Negatywistyczna osobowosc kobieca w Chamie Elizy Orzeszkowej [Электронны рэсурс] / M. Dziugiel-Łagпa // Prace Literaturoznawcze. – 2018. – № 6. – S. 99–114. – Рэжым доступу : https://czasopisma.uwm.edu.pl/index.php/pl/article/view/2663.

*Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ДР 20211211).*

## КАЛЯНДАР ПАМЯТНЫХ ДАТАЎ І ЮБІЛЕЙНЫХ ДЗЁН на 2021 год

### ЛІПЕНЬ

**1 ліпеня** – 115 гадоў з дня нараджэння Рамана Ляпіча (1906–1977), крытыка, перакладчыка

70 гадоў з дня нараджэння Валянціны Крыловіч, спявачкі, народнай артысткі Беларусі

**2 ліпеня** – 100 гадоў з дня нараджэння Галіны Азгур (1921–2015), мастачкі

**4 ліпеня** – 80 гадоў з дня нараджэння Пятра Арцёмава, мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

**5 ліпеня** – 95 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Лазарука (1926–2000), крытыка, літаратуразнаўцы, педагога

80 гадоў з дня выхаду сатырычнага выдання “Раздавім фашысцкую гадзіну”. Са жніўня 1945 г. выходзіць як сатырычна-гумарыстычны часопіс “Вожык”

**6 ліпеня** – 170 гадоў з дня нараджэння Янкі Лучыны (сапр. Неслухоўскі; 1851–1897), паэта

**7 ліпеня** – 225 гадоў з дня нараджэння Яна Антонія Чачота (1796–1847), беларускага і польскага паэта, фалькларыста, этнографа

80 гадоў з дня нараджэння Ларысы Скрыпнічэнкі, мастачкі

**8 ліпеня** – 160 гадоў з дня нараджэння княгіні Магдалены Радзівіл (1861–1945), дзячкі культурнага руху, мецэнаткі

90 гадоў з дня нараджэння Пятра Лысенкі (1931–2010), мастака

75 гадоў з дня нараджэння Аляксандра Петрыканца, мастака

**10 ліпеня** – 240 гадоў з дня нараджэння Антона Марціноўскага (1781–1855), выдаўца, публіцыста

150 гадоў з дня нараджэння Паўла Дземідовіча (1871–1931), этнографа, фалькларыста, краязнаўцы, педагога

125 гадоў з дня нараджэння Паўла Валошына (1891–1937), дзеяча нацыянальнага адраджэння, публіцыста

110 гадоў з дня нараджэння Ціхана Кандрашова (1911 – пасля 1973), рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі. У 1969–1973 гг. галоўны рэжысёр Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы

80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Цеслюка, рэжысёра, аператара дакументальнага кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

60 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Цыбульскага, мастацтвазнаўцы, мастака, педагога

**11 ліпеня** – 110 гадоў з дня нараджэння Янкі Чабора (1911–1943?), паэта, публіцыста

85 гадоў з дня нараджэння Цімоха Ліякумовіча, літаратуразнаўцы, педагога. Жыве ў ЗША

75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Някляева, паэта, празаіка

**12 ліпеня** – 90 гадоў з дня нараджэння Вячаслава Кубарава (1931–1995), мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

80 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Шолка, мастака

**13 ліпеня** – 155 гадоў з дня нараджэння Напалеона Чарноцкага (1866–1937), перакладчыка, публіцыста

80 гадоў з дня нараджэння Андрэя Андросіка (1941–2003), рэжысёра, педагога

70 гадоў з дня нараджэння Веры Кавалеравай, актрысы, заслужанай артысткі Беларусі

**14 ліпеня** – 205 гадоў з дня нараджэння Гераніма Марцінкевіча (1816–1864), беларускага і польскага паэта, празаіка, драматурга

130 гадоў з дня нараджэння Пятра Бузука (1891–1938) мовазнаўцы, літаратуразнаўцы, педагога

110 гадоў з дня нараджэння Паўла Пруднікава (1911–2000), паэта, празаіка, заслужанага работніка культуры Беларусі

75 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Дзіўніча, мастака

*Заканчэнне на с. 20.*